# Маладосць

Штомесячны
літаратурна-мастацкі
і грамадска-палітычны
ілюстраваны часопіс

(872) Ліпень, 2026

Выдаецца з 1953 года

**ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР**

Вольга Станіславаўна РАЦЭВІЧ

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

Алесь БАДАК
Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ
Уладзімір ПАЎЛОЎСКІ
Людміла САЯНКОВА
Таццяна СІВЕЦ
Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ
Аляксей ЧАРОТА
Віктар ШНІП

**РЭДАКЦЫЯ**

Ксенія ЗАРЭЦКАЯ, крытыка, публіцыстыка
Аксана КАЗЛОВА, проза

«Маладосць»
можна набыць
у аддзеле рэалізацыі выдавецтва
«Мастацкая літаратура»: г. Мінск,
пр. Пераможцаў, 11, каб. 924,
тэл. 203-80-54.

16+

Рэдакцыя не ўступае ў перапіску
з чытачамі, не рэцэнзуе і не вяртае дасланыя
рукапісы.
Пры перадруку спасылка
на «Маладосць» абавязковая.

# ЗМЕСТ

**ЯГОР ЖУКОЎСКІ.** Апошняя. *Апавяданне* . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
**АЛЯКСАНДРА КУЛАКОВА.** Каханне ў кожнай усмешцы. *Вершы* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
**ПАЛІНА БУНАС.** Свята. *Апавяданне* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
**МАРЫЯ СТАЎРАС.** Белых лілей карагоды. *Вершы* . . . . . . . 13
**ЮЛІЯ МАКАРЭВІЧ.** Песня да поўні. *Апавяданне* . . . . . . . . . 14
**МАЦВЕЙ ЛІШЫН.** Паэзія неба. *Вершы* . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
**МАРГАРЫТА ЛАТЫШКЕВІЧ.** Ваўкалакі. *Неагатычны раман. Працяг* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28

**ІНТЭРВ'Ю**
**КАЦЯРЫНА НАСУТА.** Пра людзей і пачвар . . . . . . . . . . . . . . 60

**БРАМАМАР** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72

**МУЗЕЙНАЯ ГАСЦЁЎНЯ**
**МІКОЛА ТРУС.** Асабісты шафёр трох класікаў: Ілля Яртымік 84

**З АРХІВАЎ**
**ПЯТРО ЖАЎНЯРОВІЧ.** «Вялікаму барду Беларусі». Дароўныя надпісы Генадзя Кісялёва Уладзіміру Караткевічу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91

**СТАРОНКА РОДНАЯ**
**АЛЕСЬ КАРЛЮКЕВІЧ.** Бабруйск. Літаратурнае гняздо Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96

**ПЕРАКЛАДЫ**
**УЛЬМАС УМАРБЕКАЎ, АНАСТАСІЯ ШУМІЛАВА, ІЛЬЯС ЖАНСУГУРАЎ, МАГДЖАН ЖУМАБАЕЎ** . . . . . . . . . . 105



# ЯГОР ЖУКОЎСКІ

## Апошняя

Апавяданне

***Жукоўскі Ягор нарадзіўся 15 жніўня 1996 года ў горадзе Мінску. Скончыў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт па спецыяльнасці «аўтамабільныя дарогі», а таксама магістратуру і аспірантуру названай ВНУ. Піша прозу, навуковыя артыкулы. Мастацкія творы друкаваліся ў часопісах «Маладосць» і «Полымя», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», альманаху «Першацвет», зборніку прозы «Вазьмі сваю свяцільню». Жыве ў Мінску, працуе ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце.***

Ліпа ўсведамляла свой хуткі канец. Ужо не першы год яна стаяла пры гэтай дарозе, але толькі цяпер адчуванне скону было такім блізкім.

— Не ўсе галіны шапацяць так, як шапацелі раней,— думала Ліпа.

Усё больш і больш старога ды сухога галля падала долу. Яна дзякавала Богу, што тыя, падаючы, не нарабілі нікому шкоды, а то сканала б значна раней, як і ўсе сябры і сяброўкі, з якімі разам стаялі абапал дарогі.

Яна ведала: міне яшчэ колькі год — і яе нарэшце спілуюць.

— Добра, калі гэтае пілаванне пойдзе на карысць людзям, — казала Ліпа.

У яе было шмат часу, стоячы так доўга на адным месцы, каб пераасэнсаваць жыццё. Яна ўжо не марыла. Ведала, што мары, калі да іх не прыкладаць ніякіх высілкаў, — нішто. Ёй проста хацеласяператварыцца ў якую-небудзь мэблю ды стаяць ва ўтульным цёплым пакоі і прыносіць асалоду. Але і ў будаўніцтве знайсці сваё прыстасаванне лічыла не такім ужо благім:

— Быць бэлькай — праца цяжкая, але пачэсная. Кожнаму чалавеку патрэбен дах над галавой, а бэлька — першая ў той справе: дапамагае ўсім у агульнай працы, несучы на сабе вялікі цяжар.

Аднак Ліпа ведала, што ўжо занадта старая для гэтага. Ёй рабілася ўсё горш ды горш з кожным днём. Яна пакутавала ад дуплаў, верхаліна дала расколіну, а ствол не трымаў нават тонкія і маладыя галінкі, але ўсю моц тая ўкладала ў карэнні, якімі трымалася за зямлю. Яна нават бы трывала, калі б хто вырашыў ссекчы яе на дровы:

— А што, спачатку ты дасі цяпло, а той попел, што застанецца пасля, дапаможа жыць іншым.

Калі б Ліпа была крыху маладзейшая і мела яшчэ не сапсаваную драўніну, то нават ідэя стаць труной не спалохала б яе:

— Труна патрэбна кожнаму. Не ў мяху ж хаваць! Ну і хай прыйдзецца гніць, затое ўсе ацэняць, якую ж яму добрую труну зрабілі, яна ж каштаваць мусіць — ого!

Але часы, калі дрэва шанавалі, калі яно суправаджала чалавека ад калыскі да труны і калі без яго не ўяўлялі жыццё, мінулі.



# АЛЯКСАНДРА КУЛАКОВА

## Каханне ў кожнай усмешцы

Вершы

*Кулакова Аляксандра нарадзілася 26 жніўня 2002 года ў Жодзіна. Скончыла факультэт дызайну Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Піша вершы і прозу, аўтар паэтычнага зборніка «ВершАпатыя». Лаўрэат Рэспубліканскага паэтычнага конкурсу імя Міколы Маляўкі сярод маладых паэтаў. Жыве ў Жодзіна, працуе ў ААТ «БЕЛАЗ».*

### Першае слова

З усёй неабдымнай колькасці слоў
першым было «каханне».
Але чалавек пячорны
да размоў спачатку быў не звыклы,
бо якія размовы —
дажыць бы яшчэ да світання,
шаблязубага тыгра забіць:
сабе — шкуру, жонцы —
пацеркі з вострых іклаў.

З усіх слоў, паданняў
і песень яно першым узнялося ў вечнасць,
захавалася ў кожнай усмешцы,
у горкай слязе і над морам.
Чалавек падрастаў, ваяваў,
паміраў ці наогул губляў чалавечнасць,
заставалася толькі яно —
і рабілася моцнай апорай.

У дрымучым лесе, на ратным полі,
у джунглях, гарах ці саване,
фотаздымкам у кашальку, дыханнем ветру,
на дзіцячым калене ранкай —
з усёй неабдымнай колькасці слоў
першым было «каханне».
Яно першым сыходзіць у нябыт,
але й першым вяртаецца зранку.

### Вясновыя справы

Чуеш крокі? Ці чуеш, як плача капеж?
Я таксама б, каб мог, ціха-ціха заплакаў,
Бо ва ўсіх то пачуцці, ці то мяцеж,
І для іх я звычайны забыты вясновы пісака.

Я пішу да цябе: вочы расплюшчы й
сумленна чакай,
Ды праз медную сінь зазірні за сівыя аблокі...
Там, бы птушка,
вясна над паветрам расціць ураджай,
Корміць промнямі. Чуеш цяпер яе крокі?

У яе зеляніна бруіцца валоссем
праз сонечны твар,
Снег сыходзіць атрутай, шурпаты й каравы,
Вільготным друзам пад ім шапоча бульвар.
Нам не будзе лягчэй,
але дакладна стане цікава!

Фота з архіва А. Кулаковай



# ПАЛІНА БУНАС

## Свята

Апавяданне

***Бунас Паліна нарадзілася 18 снежня 2008 года ў Мінску. Скончыла СШ № 77 горада Мінска, «Школу юнага пісьменніка» пры БДУ. Дыпламант Рэспубліканскага паэтычнага конкурсу імя Міколы Маляўкі сярод маладых паэтаў. Літаратурны дэбют у «Маладосці».***

Я ніколі не любіў карты. Заўсёды ў дурнях. І таму вечар здаваўся проста агідным: Міша і Ванька зноў уламалі на гульню. На жаданне. Узялі на слабо, як маленькага, хоць мне ўжо амаль пятнаццаць. Ды і ім столькі ж.

І вось канец гульні. У сяброў на руках па дзве карты, а ў мяне — ажно шэсць.

— Ха! — у Вані ўжо нуль.

— А Жэня зноў у дурнях,— і ў Мішы таксама нуль.

— Вам проста шанцуе,— па звычцы паспрабаваў апраўдацца я.

Нешта вельмі часта мы сталі картамі забаўляцца. Калі б зараз на двары стаяла лета, нас у дом за вушы не зацягнулі б, але лістапад светлымі ды цёплымі вечарамі не радуе. Ды і інтэрнэт дрэнна працуе. Мабыць, без карт было б зусім сумна. Калі б толькі мы яшчэ проста гулялі, а не на жаданні ўсякія.

— І што гэтым разам я зрабіць павінен? — спадзяюся, што нешта нескладанае ці хаця б не гідкае.

— Пастукайся да Лідачкі.

— Ні за што!

Як ім толькі ў галаву магло такое прыйсці? Лідачку асцерагаліся ўсе, каму не лянота. О, гэтая Лідачка! Старая і непрыгожая, яна была падобная да ведзьмы, хоць і з'яўлялася звычайнай вар'яткай. Але чуткі пра яе вядзьмарства ніколі не змаўкалі.

— Ты прайграеш ужо пяты раз,— Ваня адразу ж завёўся.— Мы і так дазволілі выконваць адно дзеянне за пяць пройгрышаў.

— А ты Лідачку наогул бачыў? Да яе нават дарослыя не падыходзяць.

— Калі збаяўся, так і скажы,— тут і Міша ў размову ўмяшаўся.— Ці ты слабак?

— Хто? Я? Я слабак?

— Так, ты.

— Ну вось яшчэ! Самі вы слабакі. Зараз пайду…

— Стой!

Я збіраўся пайсці да хаты Лідачкі, але хлопцы перагарадзілі шлях.

— Заўтра пойдзеш.

— Заўтра? Заўтра ж Пракляты дзень. Яна асабліва дзівачыць будзе.

— Слабо табе?



# МАРЫЯ СТАЎРАС

## Белых лілей карагоды

Вершы

***Стаўрас-Джаін Марыя нарадзілася 21 лістапада 1996 года ў вёсцы Міхнавічы Гомельскай вобласці. Скончыла факультэт культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Працавала ў аўтахолдынгу «Інтэлект-лізінг», на Нацыянальнай кіностудыі «Беларусьфільм». Вядучая і ўдзельніца рэспубліканскіх конкурсаў мастацтваў. Захапляецца замежнымі мовамі і музыкай, піша вершы. Літаратурны дэбют у «Маладосці».***

Фота з архіва М. Стаўрас

### Маё Палессе

Люблю свой край, які завуць Палессем:
Куп'істыя балоты і лугі,
І журавы у сінім паднябессі,
І Прыпяці павольнай берагі.
Чароўны гоман птушак на узлессі,
Лілей бялюткіх стромкія кругі —
Не параўнаць ні з чым цябе, Палессе,
Спакой душы і ніякой тугі!
Калі ж парой ў далёкі край збяруся,
І бачу я чужыя берагі,
То ўсе адно — люблю цябе, Палессе,
Майго жыцця куточак дарагі!

### Я ўлюбёная ў свой край

Я ўлюбёная ў свой край,
У бездань неба і азёрных водаў,
У жвір Дняпра — магутны вадаграй,
Які не знае бродаў-пераходаў.
У шумны гай старых бяроз,
Дзе ветрык лашчыць тонкія галінкі,
І у крышталь празрыстых рос,
Ў начнога неба зорныя пылінкі.
Ў квяцісты луг, абшар палёў,
У васількоў блакітныя галоўкі,
Дзе шмель гудзіць і процьма мурашоў,
А па рамонках — божыя кароўкі.
Зямля мая! Табе пяю,
Табе адной хачу я пакланіцца!

✦ ✦ ✦

Ляцяць буслы у свае гнёзды
З чужой, далёкай староны,
Нясуць на крылах сваіх вёсны
З часоў ссівелай даўніны.
Ляцяць на стрэхі звыклых хат,
У беларускі родны кут,
Не трэба ім краёў багатых —
Іх гнёзды тут, Радзіма тут.
Дыхне зіма у твар вятрамі,
І не сышлі з палёў снягі,
А бусел белы ужо з намі,
І чуеш клёкат дарагі.
І шчасце грудзі напаўняе —
Мая зямля, мае лясы!
І сэрца раптам замірае
Ад хараства зямной красы!



# ЮЛІЯ МАКАРЭВІЧ

## Песня да поўні

Апавяданне

***Макарэвіч (сапр. Вярбіцкая) Юлія нарадзілася 13 ліпеня 1999 года ў Мінску. Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт замежных моў, магістратуру і аспірантуру, цяпер працуе на кафедры беларускай філалогіі і замежнай літаратуры. Лаўрэат конкурсу маладых літаратараў Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы» і конкурсу маладых літаратараў «Першацвет». Друкавалася ў зборніку «Цень зоркі». Жыве ў Мінску.***

Кірыл нецярпліва хадзіў туды-сюды па мокрай зямлі, усё больш сумняваючыся ў задуме. Неба было глухое, ніводнай зоркі, а дробны гідкі дождж не спыняўся ні на хвіліну. Па дарозе сюды ён запэцкаў свае белыя красоўкі асенняй граззю. На гэтым праклятым Палессі нават паветра здавалася цяжкім і вязкім, яно пахла торфам і стаячай вадой. Пахіленыя хаткі вакол сумавалі без гаспадароў, а нешматлікія вяскоўцы, што засталіся, аддавалі перавагу таму, каб яшчэ да заходу схавацца ў сваіх хатах. Насуперак звычаю іншых беларускіх вёсак, якія Кірылу давялося ўбачыць за апошні месяц, нават дачнікі не асмеліліся купіць у Парэ танныя разваліны. Смерць жыхароў не палохала, яны жылі з ёй поплеч.

Халодны вецер паказытаў скуру. Кірыл дакладна не разумеў, чаму ўсе старажытныя рытуалы абавязкова звязаныя з нечымі пакутамі. У гэтым выпадку — з ягонымі. Нож звыкла паласнуў па левай далоні. Гарачая кроў капнула на зямлю.

— Поўні не відаць.— Кірыл прыціснуў да раны сурвэтку, адчуваючы, як кроў працягвае прасочвацца скрозь паперу.

— Таму што ты не верыш,— раздражнёна адгукнулася Саша.

Кірыл стомлена развёў рукамі. Чамусьці толькі магі задумваліся пра фізіку, астраномію і іншыя незразумелыя для чароўных істот рэчы.

— Ты чула што-небудзь пра прагноз надвор'я? Сёння, відавочна, зацьменне ўбачыць нельга.

— Чаму? — Саша ўставілася на яго, яе вочы ўспыхнулі ненатуральным, вабным бляскам у паўзмроку. У іх плёскалася старажытная, драпежная сіла. Кірыл адчуў, як да горла падступае млоснасць, а на вуснах расплываецца дурненькая ўсмешка.

— Спыніся,— ён сказаў гэта так строга, як толькі мог. У галаве шумеў лес, клікаў у свае бясконцыя лабірынты. Хлопец назіраў за тым, як яго воля плавіцца пад націскам дзікай, грубай магіі.

— Дык чаму? — паўтарыла яна глыбокім голасам.



# МАЦВЕЙ ЛІШЫН

## Паэзія неба

Вершы

***Лішын Мацвей нарадзіўся 29 лістапада 1987 года ў Гомелі. Скончыў факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Піша вершы і прозу. Творы публікаваліся ў рэспубліканскім перыядычным друку. Жыве ў Мінску, працуе педагогам-арганізатарам у ДУА «Сярэдняя школа № 226 г. Мінска».***

✦ ✦ ✦

З табой шчаслівыя сустрэнемся
У дзіўным каляровым сне.
На дробныя радкі падзелімся —
І пойдзем танчыць па расе,
Дзе пацалункамі цукровымі
Адзначым самы лепшы май.
Сустрэнемся ў блакіце словамі —
Там, між аблокаў, дзе наш рай.

### Паэзія неба

Глядзела неба, як Пясняр
На белыя рамонкі.
Натхнёна ліў «au revoir»[1]
Па дахах дождждык звонкі.
Ляцела цьмяная душа,
Знікалі вусны, вочы,
Па каліве сышла мяжа...
І толькі звон прарочы
Лунаў між зорак давідна.
Бы хрыплыя арэлі,
Бы з нерваў дрогкая струна,
У небе птушкі пелі.

### Лілеі

Квітнелі белыя лілеі
Па-над азёрнаю вадой.
І птушкі так салодка пелі,
Натхнялі летні час сабой.

Спякота напаўняла поўдзень,
Таполі рыхтавалі пух.
Мы крочылі з табой у згодзе,
Прыроды назіраўся рух.

Жыццё плыло прыгожа, мерна,
Не сапсаванае маной.
Аблокі белыя, як пена,
Узнёслы песцілі настрой.

Квітнелі ў чэрвені лілеі,
Каханнем дыхала зямля.

---

[1] Да пабачэння *(франц.)*.



# МАРГАРЫТА ЛАТЫШКЕВІЧ

## Ваўкалакі

Неагатычны раман

Праця́г. Друкуецца з №1 за 2025 год

*Латышкевіч Маргарыта нарадзілася 19 студзеня 1989 года ў Брэсце. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, працягвала навучанне ў магістратуры і аспірантуры. Працуе ў галіне наратыву камп'ютарных гульняў, жыве ў Полацку. Піша вершы і прозу. Актыўна развіваецца ў жанры міфалагічнага фэнтэзі.*

*Аўтар кніг вершаў «Пульс навальніц», «Там, дзе сэрца», кніг прозы «Яблыкі», «Наш дом», «Уласны крыж», «Лисиный перстенек», «Муры, Том і дырыжаблік», «Вершнікі на дарозе», «Век людзей», «Век песень». Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі.*

Угэтай вусцішнай, цяжкай, мулкай цішы на яе глядзелі ўсе: і вартавыя жандары, і паляўнічыя з заплямленымі мяхамі, і збялелая Марыська, і Мімі з Лапіным, якія разам выбеглі ў вітальню на гармідар, і зніякавелы Арсенцьеў. Апошні вельмі часта лупаў вачыма, усё яшчэ здзіўлены, агаломшаны, бязмерна разгублены, як чалавек, што ніколі ў жыцці не сутыкаўся з супрацівам.

— Да что же это…— з цяжкасцю выціснуў з сябе Іван Сямёнавіч, сядаючы ў лужыну. І падняў руку да твару, і працягнуў фальцэтам: — Это же… кровь!..

Соф'я жахнулася: у яго і праўда крывілі вусны, верагодна, разбітыя падчас падзення. Пакуль панна ліхаманкава думала, ці магла б забіць, сапраўды пазбавіць кагосьці жыцця, паддаўшыся спеву жалеза, хтосьці з жандараў ціхутка прысвіснуў. Злосны Арсенцьеў павярнуў галаву на гэты здзіўлены свіст і крыкнуў, ударыўшы кулаком па лужыне, ажно разляцеліся вакол брудныя пырскі:

— Чего стоите, болваны?! Помогите же, ну!

Першым з месца сарваўся дробны Ундруль, падбег і з імпэтам узяўся цягнуць начальства з лужыны. Начальства пераважвала, і на дапамогу Ундрулю падбегла, перазірнуўшыся, яшчэ пара жандараў. Крэкнуўшы, супольнымі высілкамі выцягнулі-такі. Начальства было шчасліва вызвалена з лужыны, пастаўлена на ногі і нават сяк-так пачышчана ад бруду.

— Аступіліся, паночку,— ласкава прыгаворваў Ундруль, абтрасаючы рукаў шыняля Арсенцьева.— Ай, бывае, а і нішто, нішто…

— Кой чёрт — оступился!..— працадзіў Іван Сямёнавіч скрозь зубы, вырываючы свой рукаў ва ўчэпістага Ундруля. Аддуваючыся, Арсенцьеў нервова кранууўся разбітых вуснаў і недаверліва паглядзеў на Соф'ю, застылую на парозе, быццам чакаў ад яе новага ўдару. Але спеў, спавіты гневам, улёгся ўнутры Соф'і, саступіўшы месца страху — не жандараў і не ўладаў, але самой сябе.



# КАЦЯРЫНА НАСУТА

## Пра людзей і пачвар

Вобраз пісьменніка бесперапынна змяняецца. Яны былі галасамі пакалення, ціхімі пустэльнікамі, рок-зоркамі, цяпер большасць — інфлюэнсары і блогеры, бо менавіта так можна прыцягнуць аўдыторыю, прадаць сябе выдавецтвам, а кнігі — чытачам. І сапраўды рэдкія тыя творцы, што займаюцца толькі сваёй справай. Кацярына Насута — з такіх.

У яе мноства псеўданімаў: Кацярына Лесіна, Кацярына Варанцова, Ганна Цёрн, Антон Лік і Карына Дзёміна. Менавіта кнігі, выдадзеныя пад імем Карыны Дзёмінай, патрапілі мне ў рукі дванаццаць гадоў таму. Гэтае інтэрв'ю — вельмі асабістае і асаблівае, бо роўна палову жыцця я называю яго гераіню сваёй улюбёнай пісьменніцай. Больш за пяцьдзясят разоў перачытвала тую першую кнігу, якая прывяла мяне ў жанр фэнтэзі,— «Нявесту».

У размове Кацярына выкрыла многія міфы пра пісьменнікаў, развеяла арэол таямнічасці вакол канцэпцыі натхнення, дала лайфхакі для барацьбы з негатыўнымі каментарыямі і падзялілася аўтарскім падыходам да стварэння тэкстаў. А яшчэ выслухала дзясятак фанацкіх захапленняў. І вам, чытачы, таксама прыйдзецца з імі пазнаёміцца, бо кнігі Кацярыны Насуты вартыя кожнага з іх.

### Ад чытачкі да пісьменніцы

**— Вы заўсёды любілі чытаць? А якія аўтары сфармавалі ваш густ?**

— Так, з самага дзяцінства была запойным чытачом. Лёгка «праглынала» па кніжцы ў дзень, прычым цікавілася ўсім, што было ў бібліятэцы. Вельмі любіла Джэка Лондана, Агату Крысці, Конан Дойла, Джэймса Чэйза. Памятаю, асабліва паважала дэтэктыўныя гісторыі. А яшчэ абажала навучпоп. Была такая шматтомная навукова-папулярная кніга савецкага вучонага-біёлага Акімушкіна «Мір жывёл», да дзір зачытвала. Некаторыя падыходы, якія ён выкарыстоўваў пры напісанні, ужо змяніліся, аднак увогуле кніга да гэтага часу актуальная. Крыху пазней я палюбіла фантастыку, дайшла да «Дзевяці прынцаў Амбера» Роджэра Жэлязны. Так што фарма-

# БРАМАМАР

На факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 16-ы раз падвялі вынікі рэспубліканскага літаратурнага конкурсу студэнтаў і школьнікаў «БрамаМар» імя У. А. Капцава. Да пастаянных намінацый — «Студэнцкая проза», «Студэнцкая паэзія», «Школьная проза», «Школьная паэзія», «Крытыка», «Драматургія» — дадаліся новыя: «Буктрэйлер па творы беларускай літаратуры», «Міні-драма», «Эсэ пра беларускую жанчыну». Традыцыйна асаблівая ўвага творцам-школьнікам і спецыяльная намінацыя «БрамаМар-юні». Прапануем лепшыя творы лаўрэатаў конкурсу. Знаёмцеся!



Фота з інтэрнэт-крыніц

МУЗЕЙНАЯ ГАСЦЁЎНЯ

# МІКОЛА ТРУС

## Асабісты шафёр трох класікаў: Ілля Яртымік

«Аўтамабіль — не раскоша, а сродак руху»,— сказаў галоўны герой рамана Ільі Ільфа і Яўгена Пятрова «Залатое цяля» (1931). На час выхаду твора, які заваяваў сімпатыю шматмільённай чытацкай аўдыторыі, гэтыя словы ўспрымаліся не толькі з іроніяй, але і сарказмам. Такая рэакцыя цалкам адпавядала жанравым асаблівасцям рамана. У рэчаіснасці месц «жалезнага каня» яшчэ шмат дзесяцігоддзяў пасля агучанага крылатага выразу магла сабе дазволіць далёка не кожная савецкая сям'я. У 1930-я гады гэта была прэрагатыва абраных, здабытая не па ўласным жаданні і фінансавых сродках, а дадзеная дзяржавай за высокія заслугі, з мэтай падкрэсліць статусную ўвагу да «інжынераў чалавечых душ».

Янка Купала быў неаднойчы адзначаны каштоўным падарункам. «Шэўрале» 1937 года выпуску — апошні аўтамабіль народнага паэта Беларусі, на якім з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ён выехаў у эвакуацыю разам з жонкай Уладзіслававай Луцэвіч.

Арыгінальная назва транспартнага сродку — Chevrolet Master Deluxe GA. Змяніўшы некалькі адрасоў свайго месцазнаходжання, сёння аўтамабіль экспануецца ў «Ляўках» — філіяле Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

Ад сучаснасці звернемся да эпізодаў мінулага часу, зафіксаваных сведкамі і ўдзельнікамі падзей даваеннага Мінска. Сяргей Грахоўскі ўспамінаў: «Беларускі ўрад узнагародзіў Купалу легкавою машынай. Гэта быў першы асабісты аўтамабіль у горадзе. Маленькая чорная «эмка» здавалася вяршыняй тэхнікі. Прыйшлося наймаць шафёра. Але дзядзька Янка спадзяваўся і сам навучыцца круціць «абаранку». Ён з'яўляўся ў Доме пісьменніка з кніжкамі па аўтамабільнай справе, захоплена расказваў, як авалодвае тэорыяй. А вось за рулём ніхто яго так і не бачыў. Затое паездзіць і пакатаць знаёмых вельмі ж любіў»[1].

І яшчэ адзін урывак з успамінаў С. Грахоўскага адметны тым, што ўзнаўляе культурны ландшафт сталіцы Беларусі 1930-х гадоў, у нязмушанай апавядальна-дыялагічнай форме перадае адметны невялікі эпізод жыццяпісу класіка літаратуры. Можам меркаваць, гэтая гісторыя ў свой час фальклярызавалася ў творчым асяродку рэспублікі, аўтар мемуарных запісаў не з'яўляўся непасрэдным яе сведкам. Але вось адзіны відавочца — шафёр Янкі Купалы — не названы па імені, адназначна быў прысутны на згаданай падзеі. Можна толькі здагадвацца пра колькасць цікавых эпізодаў, у тым ліку невядомых для сучаснікаў і нашчадкаў, якія засталіся, што называецца, за кадрам грамадскай увагі. Хутчэй за ўсё, гэтую гісторыю пераказалі знаёмыя Янкі Купалы — непасрэдныя ўдзельнікі апісанага выпадку. Шафёр, як набліжаная асоба да класіка, цаніўся за маўчанне.

---

[1] Грахоўскі, С. Іскрынкі памяці : старонкі ўспамінаў пра Янку Купалу / С. Грахоўскі // Беларусь. — 1981. — № 2. — С. 26.

# З АРХІВАЎ

## ПЯТРО ЖАЎНЯРОВІЧ

### «Вялікаму барду Беларусі»

Дароўныя надпісы Генадзя Кісялёва Уладзіміру Караткевічу

Сяброўскія стасункі Генадзя Кісялёва і Уладзіміра Караткевіча ўсталяваліся ўжо падчас першага знаёмства ў сакавіку 1964 года ў Вільнюсе, куды пісьменнік прыязджаў працаваць у архівах, збіраючы матэрыялы для рамана «Каласы пад сярпом тваім». Зблізіла іх і агульная даследчыцкая цікавасць да падзей XIX стагоддзя. Больш частымі сталі сустрэчы з 1971 года, калі Генадзь Кісялёў перайшоў на працу ў Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і пераехаў у Мінск. Можна сказаць, што ў 1970—1980-я гады Кісялёвы і Караткевічы сябравалі сем'ямі.

Ва ўспамінах «Ён дарыў сяброўства…», апублікаваных у 1994 годзе ў газеце «Голас Радзімы», Генадзь Кісялёў піша наступнае: «Быў ён [Караткевіч] тады ў самай лепшай форме і здаваўся проста нейкім цудам. Маладосць, шчырасць, шчодрасць, дружбацкасць, эрудыцыя, тактоўнасць. Ужо не кажу пра нейкую асаблівую беларускую мяккасць». Менавіта Генадзь Кісялёў, старшы навуковы супрацоўнік Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Літоўскай ССР, паказаў пісьменніку ваенна-судовую справу Тамаша Грыневіча, расстралянага ў Рагачове за ўдзел у паўстанні, чым пацвярджалася сямейнае паданне пра сваяка Караткевіча па мацярынскай лініі, якое ў мастацкай форме пісьменнік увасобіў у пралогу рамана «Леаніды не вернуцца да Зямлі».

У. Караткевіч высока ацэньваў росшукі Г. Кісялёва па даследаванні беларускай літаратурнай спадчыны, прысвяціў яму некалькі вершаваных твораў. З 1964 года паміж імі вялося ліставанне. Вось які верш і малюнак змешчаны ў лісце Уладзіміра Караткевіча за 6 ліпеня 1966 года.



# Бабруйск. Літаратурнае гняздо Беларусі

Адкуль бы вы ў Бабруйск ні ехалі — з Мінска ці Магілёва, з якога да старажытнага горада на Бярэзіне 110 км, ці са Жлобіна, Акцябрскага альбо са Слуцка, — кожная дарога расказвае пра цікавосткі, што здольныя стварыць маляўнічы партрэт старажытнага горада. А як толькі заедзеце ў горад, вядомасць якога са згадкі ў грамаце ад 28 красавіка 1387 г. вялікага літоўскага князя Ягайлы да яго брата Скрыгайлы, адметнасцяў, прыкмет, што ўзвышаюць Бабруйск, знойдзеце нашмат больш. Славу і біяграфію гэтаму гораду заўжды рабілі, фарміравалі людзі, асобы... І майстры прыгожага пісьменства займаюць сярод іх далёка не апошняе месца...

Са старажытным горадам цесна звязаны лёс заснавальніка нацыянальнай драматургіі, беларускага паэта, тэатральнага дзеяча, аўтара камедый «Пінская шляхта» і «Залёты» Вінцэнта **Дуніна-Марцінкевіча** (1808—1884), які нарадзіўся ў вёсцы Панюшкавічы (дакладней — у фальварку Панюшкавічы) Бабруйскага павета (сучасны Бабруйскі раён). Цяпер на месцы сядзібы класіка беларускай нацыянальнай літаратуры ўсталяваны мемарыяльны камень. У 1824 г. Вінцэнт скончыў Бабруйскае павятовае вучылішча. У 1840—1850 гг. Дунін-Марцінкевіч арганізаваў тэатральную трупу, якая наладжвала спектаклі ў Мінску, Глуску, Бабруйску і іншых мясцінах. Імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча носяць вуліцы ў Мінску, Маладзечне, Смалявічах, Бабруйску, а таксама ў Івянцы і Пяршаях на Валожыншчыне. У Бабруйску працуе Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (імя нададзена ў 1977 г.). Дзейнасць тэатра самым цесным чынам звязана з ушанаваннем драматургічнай спадчыны класіка.

У 1833 г. у Бабруйску нарадзілася пісьменніца Паўліна Юльеўна **Венгерава** (дзявочае прозвішча Эпштэйн), расійская яўрэйская пісьменніца, мемуарыстка, якая друкавала свае творы на нямецкай мове. У дзяцінстве жыла ў Брэст-Літоўску і Мінску. Вядома, што ў 1850 і 1858 гг., калі ажыццяўляўся перапіс для рэвізскіх казак, знаходзілася ў Бабруйску. У 1850 г. выйшла замуж. Яе муж, Афанасій Венгераў, працаваў некаторы час дырэктарам банка, затым, з 1880 г., у Гарадскім савеце. Разам з мужам Паўліна заснавала ў Мінску прафесійна-тэхнічнае вучылішча для бедных яўрэйскіх дзяцей. З пачатку XX стагоддзя жыла ў Германіі ў сясцёр, дзе напісала і надрукавала на нямецкай мове шэраг твораў. У тым ліку — і двухтомныя «Успаміны бабулі. Нарысы культурнага жыцця Расіі ў XIX ст.» (1908—1910). У 1914 г. вярнулася ў Мінск, дзе і памерла ў 1916 г. Сын Паўліны Юльеўны — расійскі літаратуразнаўца Сямён Венгераў (1855—1920), які выдаў унікальны «Крытыка-біяграфічны слоўнік рускіх пісьменнікаў і вучоных (ад пачатку рускай адукаванасці да нашых дзён)» у шасці тамах, іншыя гісторыка-літаратурныя і біябібліяграфічныя працы.

У Бабруйску на пачатку XX стагоддзя працаваў і служыў публіцыст, празаік, паэт, грамадскі і дзяржаўны дзеяч Фабіян Гіляравіч **Шантыр** (1887—1920), які нарадзіўся ў Слуцку. У 1914 г. ён быў прызваны ў царскую армію, служыў наглядчыкам палявога шпіталя ў Бабруйску. У 1916—1917 гг. актыўна ўдзельнічаў у рабоце клуба «Беларуская

# ПЕРАКЛАДЫ

# УЛЬМАС УМАРБЕКАЎ

## Каханне

Ад многіх старых людзей, ды і ад маіх сяброваk па інтэрнаце я часта чула, што каханне ў маладыя гады бывае сляпым. Глупства ці праўда? І смешна, і крыўдна. Але галоўнае — праўдзіва. Што зрабіць, зараз я і сама гэта разумею. Калі б было інакш — хіба я пакутавала б так? Падумаеш — Абдула-кавунчы, інакш — вялікі прафесар па кавунах і дынях! Ледзьве не плачу ад злосці — не знойдуцца, ці што, іншыя хлопцы для мяне, ды яшчэ лепшыя,— у клубе на танцах адбою няма! Але вось вярнуся дахаты, лягу, святло патушу — і такі камяк да горла падступіць, што дыхаць няма чым! Нядобра гэта: на людзях вясёлая, а прыйду дадому — плачу. І што ў ім знайшла? Хаця хлопец, канешне ж, слаўны: вочы прыгожыя, вейкі болей густыя, чым у мяне, вясёлы, а загаворыць — заслухаешся…

Але што гэта я ўсё хвалю ды хвалю, яшчэ раўці пачну. Раскажу лепей пра яго недахопы, дакладней — пра адзін, які ведаю: падумайце толькі — кожныя дзесяць дзён голіць галаву. А пасля яшчэ і адэкалонам танным так надушыцца — мухі дохнуць, чысціня вакол, адна я вытрымліваю. Глупства, праўда? Адрасціў бы валасы, зрабіў прычоску модную — прыгажуном бы стаў. Дык не, не хоча, як быццам не для яго! Хаця, можа быць, і да лепшага гэта, а то прычэшацца, ды апранецца, ды закружыць галовы маім сяброўкам… Ну і няхай, няхай апранаецца, няхай кружыць,— магчыма, я тады лёгка адвярнулася б, палёгку свайму сэрцу зрабіла… А то — пакуты: толькі прыехала ў кішлак, у першы ж дзень зачараваў — і ўсё.

Злезла я тады з машыны ля калгаснай канторы і на чамаданчык свой прысела — агледзецца хачу і страх перачакаць. «Ну вось, дажыла дзяўчынка, дарослай зрабілася, хопіць бацькоўскі хлеб пераводзіць, пакажы, чаму навучылася!» Увайшла ў кантору, чую — у пакоі старшыні людзі спрачаюцца. Я разгубілася, не ведаю, увайсці ці няхай дасварацца спярша і сярдзітымі не будуць. І ненаўмысна слухаю размову за дзвярыма.

— Тысячу разоў казаў табе, дарагі,— раздражнёна гудзіць адзін,— мне не дыні твае патрэбны, а бавоўна і бавоўна, бо яна адна дае славу, яна ж дае і ганьбу, нарэшце, яна дае план! Святыя немаўляты разумеюць гэта. Адзін ты лепш за ўсіх, самы разумны, мы ўсе — нічога не разумеем… Не дам болей зямлі — ніводнага лапіка, і не хадзі, не прасі… Апошняе маё слова!

— Сулейман-ака, ну паслухайце, толькі пяць гектараў, калі ласка,— упрошвае малады голас.— Ну добра, вось нізіна Учтэпа пустуе, калі ўжо на тое пайшло, хаця б яе дайце, бо і дыні — багацце, не толькі бавоўна…

— Сказаў — не дам. Не прасі!

Ціха стала ў пакоі. Разгубленасць мая адступіла, я пагрукалася, адчыніла дзверы. Акурат перада мною стаяў хлопец у цюбецейцы — высокі, плечы — сапраўдны багатыр! І… я пачырванела: прыгожы ён быў, і ўбачыў мяне — першы пачырванеў, спярша ён, а пасля я. Ён першы.